# СЕКЦЫЯ 4

# ПЕРШЫ УСЕБЕЛАРУСКІ З’ЕЗД: НА ШЛЯХУ ДА БЕЛАРУСКАЙ ДЗЯРЖАЎНАСЦІ

**Агееў Аляксандр Рыгоравіч**

*Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт імя А. А. Куляшова (Магілёў, Беларусь)*

## УДЗЕЛ МАГІЛЁЎСКІХ ДЭЛЕГАТАЎ У ПАДРЫХТОЎЦЫ І ПРАЦЫ ПЕРШАГА УСЕБЕЛАРУСКАГА З’ЕЗДА

Рэвалюцыя 1917 г. актывізавала нацыянальны рух за стварэнне беларускай дзяржавы. Жыхары Магілёўшчыны актыўна ўдзельнічалі ў рэвалюцыйных падзеях, у стварэнні палітычных партый і грамадскіх арганізацый, у тым ліку нацыянальных. Магілёўскі Беларускі Камітэт (МБК) стаў першай на тэрыторыі ўсходняй Беларусі ў XX ст. грамадскай арганізацыяй, якая выступала за аўтаномію, а затым і незалежнасць беларускай нацыі. Члены камітэта ўдзельнічалі ў выбарах у Магілёўскую гарадскую думу ў жніўні 1917 г., у правядзенні ў снежні 1917 г. Усебеларускага з’езда. Яны сабралі прадстаўнічы сход грамадскіх арганізацый у сакавіку 1918 г., які падтрымаў стварэнне Беларускай Народнай Рэспублікі.

Дакументы літоўскіх і беларускіх архіваў дазваляюць комплексна рэканструяваць працэс стварэння і дзейнасці ў 1917—1918 гг. у Магілёве адной з самых паспяховых беларускіх арганізацый рэвалюцыйнага перыяду — Магілёўскага Беларускага Камітэта. У дадзеным паведамленні выкарыстоўваюцца як некаторыя часткова апублікаваныя даследчыкамі, у тым ліку намі з І. А. Пушкіным у сумеснай манаграфіі малавядомыя факты і сведчанні тых гадоў [1], так і неапублікаваныя матэрыялы, якія тычацца ўдзелу магілёўцаў у працы І Усебеларускага з’езда.

Найперш трэба адзначыць, што не было наканаванасці і перадвызначанасці правядзення Усебеларускага з’езду менавіта ў Мінску. Цалкам рэальным было яго правядзенне ў Магілёве. Дзякуючы знаходжанню ў горадзе Стаўкі Вярхоўнага галоўнакамандуючага расійскай арміі яго можна аднесці да тых цэнтраў імперыі, у якіх вырашаўся лёс рэвалюцыі. Да таго ж, Магілёў па ўяўленнях тагачасных нацыянальных дзеячоў знаходзіўся ў цэнтры этнаграфічнай Беларусі, у якую ўваходзіла значная частка Смаленшчыны і Браншчыны.

У ходзе выбарчай кампаніі ва Устаноўчы сход на агульным сходзе Беларускага Нацыянальнага Саюза 12 кастрычніка 1917 г. ў г. Магілёве, аршанец М. Р. Ляўковіч пры абмеркаванні пытання правядзення з’езда беларускіх арганізацый, прапанаваў «цэнтрам Беларусі зрабіць Магілёў і па гэтай прычыне правесці з’езд» [7, арк. 50—50 адв.]. Беларускія арганізацыі Падняпроўя прапаноўвалі 5 студзеня 1918 г. склікаць у Магілёве з усёй Беларусі прадстаўнікоў земстваў, гарадскіх дум, саветаў, беларускіх партый і арганізацый і ўтварыць тут часовы орган кіравання краем — Беларускі народны савет. Яго галоўная місія палягала б у правядзенні выбараў у пастаянны орган улады — Беларускую краёвую думу. Магілёў мог стаць першай сталіцай Беларусі ў XX ст. [11].



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Паралельна з удзелам у выбарчай кампаніі МБК супольна з Цэнтральнай Радай Беларускіх арганізацый беспаспяхова ініцыяваў перад Стаўкай Вярхоўнага галоўнакамандавання Расійскай імперыі правядзенне ў Магілёве з'езда беларускіх вайсковых арганізацый» [1, с. 40].

Члены Магілёўскага Беларускага Камітэта актыўна далучыліся да падрыхтоўкі першага агульнанацыянальнага форуму беларусаў — Усебеларускага з'езду. У адозве, выдадзенай МБК з гэтай нагоды, звярталася ўвага на тое, што «разлад, унесены ў апошні час у шэрагі рускай дэмакратыі», пагражае поўным развалам і анархіяй усёй дзяржаве. Такая небяспека штурхае «сыноў шматпакутнай Беларусі ўзяць на сябе задачу захавання цэласнасці сваёй радзімы і здабытых свабод ад замахаў, з чыйго б боку яны ні зыходзілі» [у перакладзе аўт.] [1, с. 44].

У Магілёве 1 снежня ў зале Гарадской Думы адбыўся Сход Беларусаў, на які МБК запрасіў Выканаўчы камітэт Магілёўскага губернскага савета сялянскіх дэпутатаў. На сходзе быў прыняты Наказ ад Магілёўскай Беларускай Рады дэлегату на Усебеларускі З'езд. Сход лічыў. што ўвесь Беларускі народ павінен быць аб'яднаны ў адну цэлую аўтаномную адзінку, якая будзе ўваходзіць як раўнапраўны член у адзіную дэмакратычную федэратыўную Расійскую Рэспубліку, для чаго выканаўчы Камітэт настойваў на неабходнасці прадстаўніцтва ад беларускага народа на міжнароднай мірнай канферэнцыі. Па «Зямельным пытанні» меркавалася, што зямля павінна перайсці ў карыстанне працоўнага народа, а ўмовы пераходу і спосабы землекарыстання будуць распрацаваны Устаноўчым Кангрэсам. Вялікая ўвага ў наказе была таксама прысвечана фарміраванню нацыянальных Беларускіх войск» [6, арк. 38—43 адв.].

Падобныя наказы і звароты да агульнанацыянальнага форуму беларусаў складаліся ў той час у беларускіх арганізацыях, установах, воінскіх часцях па ўсёй Беларусі і за межамі нашай краіны. Так, у Нацыянальным архіве Рэспублікі Беларусь захаваўся наказ воінаў беларусаў 404-й пешай (пяхотнай) Магілёўскай дружыны дэлегатам І-га Усебеларускага з'езда» з вельмі падобнымі да Наказа МБК патрабаваннямі [1, с. 45—46].

На Усебеларускі з'езд у Мінск ад павятовых і губернскіх земстваў быў абраны Даніла Васілеўскі, ад валасных земстваў Магілёўскай губерні — З. Міхайлаў [2, С. 15—16]. Прысутнасць дэлегацыі ад Магілёўскай губерні на Усебеларускім з'ездзе ўзгадваецца ў даведцы аб Урадзе БНР [3, С. 940]. Захавалася пасведчанне МБК № 221 ад 2 снежня 1917 г. аб дэлегаванні ад МБК на з'езд Д. Аляхновіча [4, с. Арк. 18]. Па некаторых дадзеных, брат Зміцера — актыўны сябра МБК Яўген Сямёнавіч Аляхновіч быў таксама дэлегаваны на гістарычны з'езд ад імя педагагічнай рады Магілёўскага настаўніцкага інстытута [5]. Пратакол пасяджэння Выканаўчага камітэта Магілёўскай Беларускай Рады ад 24 снежня 1917 г. сведчыць аб вылучэнні дэлегатамі на Усебеларускі з'езд таксама М. Кахановіча і В. Какашынскага. На пасяджэнні Усебеларускага з'езда 7 снежня прагучалі прывітальныя тэлеграмы, у тым ліку ад Булгака з Магілёва. Дзявятага снежня на з'ездзе быў абраны Прэзідыум, у склад якога ад сялян Магілёўскай губерні ўвайшоў Альховік (Альхоў (Ольков)?) [1, с. 46—48; 10, арк. 5—8].

11 снежня 1917 г. адбылося пасяджэнне ваеннай секцыі Усебеларускага з'езда, падчас якога прагучалі выступы з рэгіёнаў. Ад імя 404 пяхот-



Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова

най Магілёўскай дружыны (Румынскі фронт) прывітанне Беларускай Радзе выказаў Макарэвіч [8, арк. 17—17 адв.].

Наяўныя крыніцы вельмі фрагментарна адлюстроўваюць удзел прадстаўнікоў МБК ва Усебеларускім з'ездзе. Вядома толькі, што Д. Даўгяла меўся зрабіць даклад аб стане народнай адукацыі ў краі, а М. Кахановіч на адным з пасяджэнняў выступіў з заклікам не адкладваць справу самавызначэння, «бо за нас можа вырашыць Вільгельм ці польскія легіёны» [12, с. 203—209].

Захаваліся нешматлікія чарнавікі пратаколаў пасяджэнняў культурна-асветніцкай камісіі Усебеларускага з'езда з фрагментамі выступленняў члена МБК Зміцера Аляхновіча, які не стаў пасіўным сведкам гістарычнай падзеі, а актыўна ўдзельнічаў у дыскусіях. Так, напачатку працы камісіі ён спрыяў нармалізацыі яе дзейнасці: прапанаваў выступоўцам трымацца парадку дня, даручыць камісіі падрыхтаваць даклады па пытаннях парадку дня, а надалей прапаноўваў абмежаваць колькасць запісаў прамоўцаў і час іх выступленняў. Сярод іншага Аляхновіч падтрымаў важнасць развіцця вышэйшай адукацыі ў краі і звярнуў увагу прысутных на неабходнасць вяртання інвентару былых вышэйшых навучальных устаноў. На ранішнім пасяджэнні 10 снежня па ініцыятыве Аляхновіча пытанне аб беларускай мове ў школе было пастаўлена першым [9, арк. 1, 4—7]. Па сутнасці, пры абмеркаванні гэтай праблемы Аляхновіч выказваў пазіцыю МБК, які не раз абмяркоўваў гэтае пытанне і выступаў за паступовае адраджэнне беларускай мовы.

Усебеларускі з'езд быў разагнаны бальшавікамі 17 снежня 1917 г. Варта адзначыць неадназначныя адносіны насельніцтва Магілёўшчыны да з'езда. У адрозненне ад інтэлігенцыі, якая ў большасці вітала правядзенне з'езда і прынятыя ім рэзалюцыі, IV Магілёўскі агульнагубернскі з'езд сялянскіх дэпутатаў (15—18 снежня) у сваёй рэзалюцыі «Аб Усебеларускім з'ездзе» пастанавіў дэлегатамі на Усебеларускі з'езд саветаў лічыць прадстаўнікоў саветаў, а не «самазваных Беларускіх Рад і Грамад». Рэзалюцыя была прынята па ініцыятыве прабальшавіцкі настроенай часткі кіраўнікоў з'езда [1, с. 50].

Бальшавіцкая ўлада прадстаўляла хлуслівую інфармацыю аб з'ездзе і прычынах прыпынення яго працы. Патрыёты Беларусі імкнуліся давесці сваю праўду аб з'ездзе. Гэта добра бачна з ліста пісара Вайсковай Рады Міколы Шылы на пачатку 1918 г. Міхасю Кахановічу ў Магілёў. У ім прагучала просьба, каб ва ўсіх магілёўскіх газетах быў надрукаваны пратэст Выканаўчага Камітэта Рады І-га Усебеларускага з'езду наконт хлусні Л. Троцкага аб прычынах і абставінах разгону з'езда, выказанай у адказе на запыт прадстаўніка аўстра-германскай дэлегацыі на пасяджэнні мірнай дэлегацыі ў Брэсце 14 студзеня 1918 г. [1, с. 50; 2, с. 42—43].

Вынікі з'езда былі заслуханы на пасяджэнні Выканаўчага камітэта Магілёўскай Беларускай Рады 3 студзеня 1918 г. Сярод іншага былі заслуханы даклады аб з'ездзе Д. Аляхновіча і М. Кахановіча. Першы падрабязна распавёў пра адкрыццё з'езда і першыя пасяджэнні, падкрэсліў «вялікае значэнне З'езда ў справе папулярызацыі ідэі аўтаноміі Беларусі», далей паведаміў аб пасяджэннях пасля разгону з'езда. Абмеркавалі праект рэзалюцыі з'езда аб арганізацыі Краёвай улады ў Беларусі. М. Кахановіч прапанаваў «прыняць рэзалюцыю пратэсту супраць разгону З'езда і ўвогуле супраць перашкоды самавызначэння Беларусі і распаўсюдзіць яе ў Магілёўскай губерні, а таксама паслаць ва ўсе месцы Расійскай Рэспублікі» [1, с. 50].



Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова

Такім чынам, першапачаткова планавалася правесці Усебеларускі з'езд у г. Магілёве, сябры магілёўскіх нацыянальных палітычных арганізацый і ініцыятыў прынялі актыўны ўдзел у падрыхтоўцы і працы І Усебеларускага з'езда, а затым даносілі да грамадскасці інфармацыю аб з'ездзе і ідэях, якія на ім выказваліся, што дазволіла ў 1918 г. арганізаваць у Магілёве сход у падтрымку ўтварэння Беларускай Народнай Рэспублікі.

**Бібліяграфічны спіс**

1. Агееў, А. Р. Фарміраванне і дзейнасць Магілёўскага Беларускага Камітэта (1917—1918): манаграфія / А. Р. Агееў, І. А. Пушкін. — Магілёў: МДУ імя А. А. Куляшова, 2017. — 292 с.: іл.

2. Архівы Беларускай Народнай Рэспублікі. Т. 1. Кн. 1. — Вільня–Нью-Ёрк–Менск–Прага: БІНІМ; Т-ва Беларускага пісьменства; Наша Ніва, 1998. — С. 1—850.

3. Архівы Беларускай Народнай Рэспублікі. — Т. 1. Кн. 2. — Вільня–Нью-Ёрк–Менск–Прага: БІНІМ; Т-ва Беларускага пісьменства; Наша Ніва, 1998. — С. 851—1721.

4. Журнал выхадных папер МБК. 1917 г. // Беларускі дзяржаўны архіў-музей літаратуры і мастацтва (БДАМЛМ). Фонд 3. Воп. 1. Спр. 137. Арк. 3—19.

5. Ляхоўскі У. Магілёўскі настаўніцкі інстытут // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: у 6 т. — Т. 5. — С. 26.

6. Наказ от Могилевской Белорусской Рады делегату на Всебелорусский съезд 5 декабря 1917 г. в г. Минске // Lietuvos moksli akademijos Vrublevskių biblioteka Rankraščių skurius. Цэнтральная бібліятэка Акадэміі навук Літвы. Аддзел рукапісаў. Фонд 21. Спр. 2218. Арк. 38—39, 43—43 адв.

7. Пратакол агульнага сходу Беларускага Нацыянальнага Саюза 12.10.1917 г. // БДАМЛМ. Фонд 3. Воп. 1. Спр. 136. Арк. 49—50 Адв.

8. Пратакол пасяджэння Ваеннай секцыі Агульна-Беларускага з'езда. 14.12.1917 г. // Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). Фонд 325. Воп. 1. Спр. 4. Арк. 17—17 Адв.

9. Пратаколы пасяджэнняў культурна-асветніцкай камісіі 1-га Усебеларускага з'езда // НАРБ. Ф. 457. Воп. 1. Спр. 1. Арк. 1—13 Адв.

10. Пратаколы пасяджэнняў Усебеларускага нацыянальнага з'езда // Lietuvos centrinis valstybės archyvas (LCVA) Літоўскі цэнтральны дзяржаўны архіў Фонд 582. Воп. 1. Спр. 1. Арк. 5—8.

11. Пушкін І. А. Як Магілёў мог стаць сталіцай Беларусі ў 1917 годзе // Гісторыя Магілёва: мінулае і сучаснасць: зборнік навуковых прац удзельнікаў IX Міжнар. навук. канф. — Магілёў, 2015. — С. 135—141.

12. Рудовіч, С. У пошуках нацыянальнай ідэнтычнасці: Беларуская патрыятычная арганізацыя ў Магілёве ў 1917—1918 гг. / С. Рудовіч // Мінулая і сучасная гісторыя Магілёва: зборнік навуковых прац / уклад. І. А. Пушкін. — Магілёў: Магілёўская абласная ўзбуйненая друкарня, 2001. — С. 203—209.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова